# УДЗЕЛ БССР У АЖЫЦЯЎЛЕННІ ПАЛІТЫКІ СССР НА ГЕРМАНСКІМ НАПРАМКУ (1922-1991 гг.)

Стралец М.В.

*Брэсцкі палітэхнічны інстытут*

У красавіку 1922 года былі устаноўлены дыпламатычныя адносіны паміж ССРБ і Германіяй. Пасол Савецкай Расіі у Берліне М.М. Крэсцінскі адначасова быў і паслом ССРБ. 30 снежня 1922 года быў утвораны СССР і размова аб дыпламатычных адносінах паміж ССРБ і Германіяй больш не ішла. Аднак сувязі паміж імі не перарываліся.

Новым значным этапам знаемства немцаў з беларускай культурай з'явілася другая палова 20-х гадоў. Паездка у 1925 г. Я. Купалы, Ц. Гартнага і М. Чарота у Берлін, запрашэнне у 1926 г. на Акадэмічную канферэнцыю у Мінск вядомых нямецкіх славістаў М. Фасмера і Е. Бернекера заклалі асновы кантактаў у новых умовах. Дзякуючы высілкам гэтых людзей у Германіі убачыла свет кніга Я. Карскага «Гісторыя беларускай народнай творчасці і літаратуры» – перапрацаваны варыянт трэцяга тома ягонага манаграфічнага даследвання «Беларусы».

На жаль, гэты этап аказаўся не вельмі працяглым. З наступленнем у СССР сталінізму і прыходам да улады Гітлера у Германіі спрыяльны перыяд узаемных культурных спасціжэнняў скончыўся.

У 1920 – пачатку 1930-х гг. адбыліся станоўчыя зрухі у адносінах беларускіх уладаў да этнічных немцаў.

У сярэдзіне 1920-х гадоў у БССР пражывала 7075 немцаў, большасць з іх – у тагачаснай Мазырскай акрузе. У нямецкіх пасяленнях меліся нацыянальныя школы. У сярэдзіне 1930-х гадоў настаўнікаў для іх рыхтавалі педагагічныя ВНУ Аўтаномнай Рэспублікі Немцаў Паволжа і, часткова, г. Ленінграда. У раённых газетах Нараўлянскага і Ельскага раёнаў у 1930-х гадах шэраг матэрыялаў друкаваўся на нямецкай мове.

На жаль, наступіў час, калі такое стаўленне уладаў змянілася на супрацьлеглае. З узмацненнем рэжыма таталітарызма паступова згортваецца нацыянальнае будаўніцтва сярод немцаў Беларусі. зачыняюцца школы, ліквідуюцца нацыянальныя сельскія Саветы. У пачатку 1940-х гадоў немцы трапляюць пад прымусовае высяленне.

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна Савецкага Саюза. Менавіта у гэты дзень Нямеччына напала на СССР.

Увосень 1941 года немцы выразна акрэслілі ваенна-адміністрацыйны падзел Беларусі. Пры гэтым яны зыходзілі з загада А.Гітлера ад 17 ліпеня 1941 года «Аб кіраванні у зноў захопленых усходніх абласцях». Складовай часткай рэйхскамісарыята «Остланд» стала генеральная акруга Беларусь. Прыблізная усходняя мяжа гэтай акругі праходзіла па лініі Полацк-Барысаў, паўднёвая мяжа — па лініі Старыя Дарогі — возера Чырвонае, заходняя мяжа - па лініі ракі Зальвянка - усходняя ускраіна Белавежскай пушчы. Нясклад на прыйсці да высновы аб тым, што немцы не улічвалі пры гэтым падзеле этнічны фактар.

Гэта выснова падмацоўваецца інфармацыяй пра лес іншых беларускіх тэрыторый. Паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай, Пінскай і Берасцейскай абласцей сталі складовай часткай рэйхскамісарыята «Украіна». Таксама не было этнічных падстаў для таго, каб уключаць акругу «Беласток» у склад Усходняй Прусіі. Гэтая акруга была ўтворана з Беластоцкай вобласці і часткі Баранавіцкай вобласці. Спрадвечна беларускія Ашмянскі, Свірскі і Відзаўскі раёны сталі складовай часткай генеральнай акругі «Літва». Лінія Полацк-Барысаў-рака-Бярэзіна-возера Чырвонае аддзяляла вобласць аховы тылу групы армій «Цэнтр» ад астатняй беларускай тэрыторыі.

У час Вялікай Айчыннай вайны бальшавікі былі гатовы так сябе паводзіць, як і ў час распрацоўкі Берасцейскай мірнай дамовы 1918 года. Увосень 1941 года Сталін, не будучы ўпэўненым, што ўдасца адстаяць Маскву, зрабіў праз пасрэднікаў Гітлеру прапанову аб замірэнні. У якасці умовы аб замірэнні ён быў гатовы аддаць Германіі Прыбалтыку, Беларусь, Украіну. Але рэйхсканцлер рэагаваў адмоўна, і пытанне аб гандлі Беларуссю і іншымі тэрыторыямі адпала.

А зараз ёсць сэнс спецыяльна спыніцца на фактары айчыннай дыяспары ў беларуска-нямецкіх сувязях часоў другой сусветнай вайны.

Складаныя міжнародныя абставіны напярэдадні 2-й сусветнай вайны, пачатак яе і захоп Германіяй Польшчы, уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР актывізавалі палітычнае жыццё беларускай эміграцыі ў заходнееўрапейскіх краінах. Акрамя таго, яна папоўнілася дзеячамі, якія не давяралі савецкай уладзе і выехалі з Заходняй Беларусі пасля заняцця яе Чырвонай Арміяй. У выніку ваенных дзеянняў Германіі ў палон трапіла70000 беларусаў, што ваявалі ў складзе польскага войска. Гэтыя акалічнасці сазейнічалі росту зацікаўленасці нямецкіх улад да беларускага пытання.

Пераканаўчы доказ такой зацікаўленнасці можна прасачыць ужо ў лістападзе 1939 г. Менавіта тады пачало адлік сваёй гісторыі беларускае прадстаўніцтва, якое функцыянавала пры Міністэрстве унутранных спраў Германіі. Яно займалася выяўленнем асоб беларускай нацыянальнасці, якія пражывалі ў Германіі і на захопленых ёю тэрыторыях. У розныя часы Беларускае прадстаўніцтва ўзначальвалі Ф. Акінчыц, А. Шкуцько і інш. У 1940 г. пры Беларускім прадстаўніцтве быў утвораны так званы Беларускі камітэт самапомачы з філіяламі ў Варшаве, Празе, Вене, Лодзі, Мюнхене і іншых гарадах. Беларускае прадстаўніцтва і Беларускі камітэт самапомачы цесна супрацоўнічалі з германскімі разведслужбамі і службай бяспекі (СD), вялі работу сярод ваеннапалонных беларусаў, былых салдат Войска Польскага. Па меры набліжэння пачатку вайны дзейнасць Беларускага прадстаўніцтва і Беларускага камітэта самапомачы выкарыстоўваліся ў разведвальнай і прапагандысцкай рабоце, арганізацыі дыверсійных груп, падрыхтоўцы кадраў цывільнай адміністрацыі для Беларусі. 19.06.1941 г. у Берліне на нарадзе прадстаўнікоў Беларускага прадстаўніцтва і Беларускага камітэта самапомачы быў утвораны так званы Беларускі нацыянальны цэнтр на чале з М. Шчорсам. У склад яго кіраўніцтва увайшлі Р. Астроўскі, А. Шкуцько, М. Шкяленак, Ч. Ханяўка, В. Тулаш, В. Гадлеўскі. Беларускі нацыянальны цэнтр меў на мэце

стварэнне беларускай дзяржавы пад нямецкім пратэктаратам. З пачаткам вайны супраць СССР Беларускі нацыянальны цэнтр распауся. Яго члены займалі розныя пасады ў акупацыйным апараце гітлераўцаў на тэрыторыі Беларусі.

Апорай немцаў у час акупацыі былі калабаранты. Размова ідзе пра Беларускую народную самапомач (БНС), корпус Беларускай самааховы (БСА), Саюз беларускай моладзі (СБМ), Беларускую цэнтральную раду (БЦР).

27 чэрвеня 1944 г. у Мінску адбыўся так званы другі усебеларускі кангрэс, які арганізавала і праводзіла БЦР. Кангрэс абвясціў сябе «паўнапраўным і найвышэйшым прадстаўніком беларускага народа». 3 ліпеня 1944 г. у Мінск уступіла Чырвоная Армія, і тых дзеячоў, якія мелі дачыненне да дадзенага кангрэса, тут ужо не было.

У 1941-1944 гг. немцы нават і не ставілі пытання аб аднаўленні беларусай дзяржаўнасці.

А зараз звернемся да наступстваў Вялікай Айчыннай вайны для нашай краіны. Беларусь у вайне страціла больш за палавіну нацыянальнага багацця. Сума матэрыяльных страт склала 75 млрд. руб. (у цэнах 1941 года). Было разбурана і спалена 209 гарадоў і раённых цэнтраў (з 270), 9200 вёсак, разбурана 100465 прадпрыемстваў, больш за 6000 км чыгункі, разрабавана 10000 калгасаў, 92 саўгасы, 316 МТС, знішчаны 420996 дамоў калгаснікаў, амаль усе электрастанцыі, вывезена ў Германію 90 % станочнага і тэхнічнага абсталявання, каля 96 % энергетычных магутнасцей, каля  18,5 тысяч аўтамашын, больш за 9000 трактараў і цягачоў, тысячы кубаметраў драўніны, піламатэрыялаў, высечаны сотні тысяч гектараў лесу, садоў і г.д. Да лета 1944 на Беларусі засталося толькі 39 % передваеннай колькасці коней, 31 % буйной рагатай жывелы, 11 % свіней, 22 % авечак і коз. Вораг знішчыў тысячы устаноў асветы, аховы здароўя, навукі і культуры, у тым ліку 8825 (з 12294) школ, усе навукова-даследчыя центры, АН БССР, 219 бібліятэк, 5425 музеяў, тэатраў і клубаў, 2187 бальніц і амбулаторый, 2651 дзіцячую ўстанову. Самымі цяжкімі былі людскія страты: загінула больш за 2,2 млн. чалавек... На катаржныя работы у фашысцкую Германію было вывезена 380 тысяч чалавек.

Кіраўніцтва БССР яшчэ да заканчэння ваенных дзеянняў паставіла пытанне аб тым, што немцы павінны кампенсаваць велізарнейшыя страты, прычыненыя рэспубліцы і яе народу. Зразумела, нельга недаацэньваць тое, што атрымала БССР.

Па-першае, размова ідзе аб рэпарацыйных выплатах.

Па-другое, з савецкай зоны акупацыі было вывезена шмат самага разнастайнага абсталявання.

Па-трэцяе, у працэсе аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі актыўна выкарыстоўвалася праца нямецкіх ваеннапалонных.

Разам з тым  больш чым на паўстагоддзя расцягнулася пытанне аб выплаце кампенсацыі остарбайтэрам. Зараз, калі гэта выплата ажыццяўляецца, іх засталася адносна невялікая колькасць.

Адным з наступстваў вайны было тое, што у масавай свядомасці беларусаў трывала адклаўся вобраз ваяўнічага немца, немца-фашыста, немца, апантанага імперскімі памкненнямі.

А зараз звернемся да удзелу БССР у супрацоўніцтве СССР з ФРГ і ГДР (1949-1990 гг.).

З БССР экпартавалі ў ФРГ трактары "Беларусь", грузавыя аўтамабілі, станкі, электра-тэхнічныя вырабы, дызельнае паліва, бензін, шкуркі норкі, драўняна-валакністыя пліты, сувеніры, дзіцячыя цацкі, баваўняныя тканіны, сталовыя камплекты.

ФРГ імпартавала ў БССР тавары народнага спажывання, напрыклад, скураны абутак.

Заўважым, што аб'емы экпарту і імпарту былі нязначнымі.

Даволі сціплым быў удзел БССР у вытворча-тэхнічных сувязях паміж СССР і ФРГ. Справа так і не дайшла да буйных доўгатэрміновых праектаў. Аднак для паўнаты карціны есць сэнс прывесці канкрэтыку.

Беларускія спецыялісты наладжвалі станкі айчыннай вытворчасці ў Заходняй Германіі, навучалі грамадзян ФРГ працаваць на трактары "Беларусь". Спецыялісты ФРГ у ліку іншых манціравалі абсталяванне на Гродзенскім азотна-тукавым заводзе.

БССР удзельнічала ў рознага рода выставах, праваДзімых на тэрыторыі ФРГ. Заходнегерманскія фірмы ўдзельнічалі ў выставах у Мінску. У час працы гэтых выстаў беларусы і немцы нярэдка заключалі кантракты. Былі выпадкі, калі ў ФРГ патэнтаваліся вынаходніцтвы беларусаў.

Тыя абставіны, што зусім невялікая частка беларусаў наведала ў аналізуемы перыяд ФРГ, мела сваім лагічным працягам захаванне стэрэятыпаў, навязаных сярэднестатыстычнаму беларусу камуністычнай прапагандай. Яму ўнушылі, што сярэднестатыстычны бундэсбюргер-рэваншыст, мілітарыст, апантаны імперскім мысленнем. Ва ўмовах жалезнай заслоны беларусы былі пазбаўлены магчымасці ведаць аб тым, што заходнія немцы лічаць глыбока памылковым браць на ўзбраенне імперскую ідэю папярэдніх эпох, што на іх вельмі ўздзейнічае комплекс гітлерызма, комплекс віны, комплекс гістарычнай адказнасці.

Прадпрыемствы Мінска і Брэста, Віцебска і Магілева, Маладзечна, Оршы, Барысава, Наваполацка і іншых гарадоў БССР накіроўвалі ў ГДР грузавыя аўтамабілі і трактары, габляваныя, шліфавальныя, заточныя і працяжныя станкі, падшыпнікі, электронна - вылічальныя машыны, радыепрыемнікі, тэлевізары, вымяральную апаратуру, паўправадніковыя дэтал. Ішлі ў ГДР беларуская нафта, серная кіслата, паліэтылен, капралактам, ліставое шкло, драўняна-стружкавыя пліты.

Шмат пазіцый уключаў і імпарт з ГДР у БССР. Можна, у прыватнасці, назваць кавальна–прэсавае абсталяванне, дакладныя прылады, медыцынскае абсталяванне, лічыльныя і пішучыя машыны, ткацкія станкі, сельскагаспадарчую тэхніку, лакі, фарбавальныя экстракты, растваральнікі.

БССР падтрымлівала культурныя сувязі спачатку з усходняй і заходнімі зонамі акупацыі, а затым з ГДР і ФРГ.

Зразумела, што сувязі з усходняй зонай акупацыі, ГДР былі на некалькі парадкаў большымі ў плане інтэнсіўнасці, маштабаў, чым з заходнімі зонамі, ФРГ.

Ведучы гаворку пра сувязі БССР–ГДР, трэба асабліва выдзеліць славістаў з ГДР .

Вельмі пленна працавалі перакладчыкі з беларускай і рускай моў. Дзякуючы іх працы усходнегерманскі чытач адкрыў для сябе В.Быкава, А. Адамовіча, А. Кудраўца, Я. Брыля, В.Караткевіча, М.Танка, І.Мележа, І.Шамякіна. Найвялікшай папулярнасцю карыстаўся В.Быкаў.

Былі усталяваны і развіваліся партнерскія сувязі паміж Магілевам і Прэмніцам, Віцебскай вобласцю і акругай Франкфурт-на-Одэры, Мінскай вобласцю і акругай Патсдам.

У 1985 г. усе вобласці БССР мелі сістэматычныя сувязі на аснове дагавароў з 2 акругамі ГДР.

Станоўчы уплыў на сувязі паміж ГДР і БССР меў факт адкрыцця у 1972 г. Генеральнага консульства ГДР у Мінску.

Культурныя сувязі паміж БССР і ГДР насілі рэгулярны, сістэматычны характар.

На дагаварной аснове на працягу многіх гадоў развівалася супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Йенскім універсітэтам імя Ф.Шылера, Беларускім навукова-даследчым інстытутам земляробства (Жодзіна) і Навукова-даследчым інстытутам селекцыі раслін ГДР.

З 1945 г. у перакладзе на беларускую мову было выдадзена 63 кнігі нямецкіх пісьменнікаў.

Паміж ГДР і БССР наладзіўся сістэматычны абмен культурнымі каштоўнасцямі.

У 1948-1989 гг. афіцыйная прапаганда падавала беларусам развіцце сітуацыі у ГДР выключна у ружовых фарбах. Таму сярэдне-статыстычны беларус не меў яснага ўяўлення аб сапраўдных прычынах Берлінскіх крызісаў 1948-1949 гг. і 1958-1961 гг, народнага паўстання ў ГДР 1953 г., не мог аб'ектыўна параўноўваць сацыяльна-эканамічныя мадэлі ФРГ і ГДР. Натуральна, што для жыхароў БССР былі нечаканымі і падзенне Берлінскай сцяны, і імклівыя тэмпы аб'яднання Германіі.

Важнейшай крыніцай ведаў для заходніх немцаў пра Беларусь і беларусаў былі працы і выступленні прадстаўнікоў беларускай дыяспары. Назавем, у прыватнасці, Я. Станкевіча, С.Станкевіча, П. Урбана, Г. Немігу, Я. Менскага, М. Куліковіча. Асабліва трэба сказаць пра Юрыя Попку. Менавіта дзякуючы яго высілкам з 1982 г. пачаў адлік свайго існавання беларускі музей у Ляймене. Ю.Попка стаяў ля вытокаў Інстытута беларусазнаўства. 13 гадоў налічвае гісторыя часопіса "Веткі", заснавальнікам і выдаўцом якога з'яўляецца дадзены інстытут.

Вядома, што творчыя сілы беларускай эміграцыі (на глабальным узроўні) гуртуюцца вакол заснаванага у 1951 г. у Нью-Йорку Беларускага інстытута навукі і мастацтва (БІНіМ). Створаны у 1955 г. аддзел БНІіМа ў Мюнхене вырас у самастойную арганізацыю, якая дзейнічала да 1966 г..

І заходнія немцы таксама, як і усходнія, пазнаеміліся з творчасцю В.Быкава і высока яе ацанілі.

Мелі месца кантакты паміж грамадскімі арганізацыямі ФРГ і БССР. Да маскоускага договора, змацаванага 12 жніуня 1970 года подпісамі канцлера ФРГ В.Бранта і старшыні Савета Міністрау СССР А.М. Касыгіна, яны былі вельмі рэдкімі. Адзін з нямногіх прыкладау – наведванне сталіцы рэспублікі дэлегацыяй прафсаюза паштовых служачых ФРГ (чэрвень 1967 г.).

Пасля падпісання савецка-заходнегерманскага дагавора падобныя кантакты сталі больш частымі. Завязаліся адносіны паміж гаварыствам "ФРГ-СССР" і Беларускім таварыствам сяброуства і культурных сувязяу з замежнымі краінамі (снежань 1973 г.). ФРГ наведвалі дэлегацыі з Белсаупрофа, галіновых прафсаюзау, маладзежных арганізацый. Іх калегі з Заходняй Германіі наносілі візіты у адказ.

Усе сустрэчы такога рода насілі чыста пратакольны характар. Паездкі з беларускага боку жорстка кантраляваліся КПСС- КПБ, КДБ. Кантакты паміж грамадскімі арганізацыямі ФРГ і БССР так і не сталі рэгулярнымі, сістэматычнымі. Іх размах быу нязначны.

Развівауся кнігаабмен з бібліятэкамі ФРГ, мелі месца паездкі беларускіх навукоуцау у ФРГ, заходнегерманскіх – у БССР. Беларускія артысты выступалі у ФРГ, заходнегерманскія – у БССР.Адным з напрамкау сувязяу паміж БССР і ФРГ былі турызм і спорт. Аднак усе гэта было ў даволі нязначных масштабах.

У беларуска-нямецкіх сувязях 1945-1991 г. поунасцю выключаўся улік такога фактара як наяунасць этнічных немцау у складзе насельніцтва БССР.

Нямецкая нацыянальная меншасць жыве на тэрыторыі Беларусі з часоу Гедыміна, які княжыу у ВКЛ у 1316-1341 гг.. Яе колькасць зауседы была адносна невялікай, не ішла ні у якае пароунанне з колькасцю такіх нацыянальных меншасцяу, як палякі, габрэі. Разам з тым этнічныя немцы занялі важнае месца у айчыннай гісторыі, пакінулі след у розных сферах грамадскага жыцця.

У аналізуемы перыяд улады былога СССР ігнаравалі нацыянальна-культурныя патрэбы этнічных немцау, зразумела, і тых, што жылі на тэрыторыі БССР.

Пасля другой сусветнай вайны нямецкая этнічная група Беларусі аднауляецца за кошт перасялення з розных районау СССР, і пры дастаткова хуткім яе прыросце (у 1976 г. -2451, у 1989 г. 3527 чалавек) прыходзіцца весці размову аб аднаўленні толькі паловы даваеннай колькасці нямецкага насельніцтва.

Вядома, што з 1973г., абедзьве германскія дзяржавы з'яуляліся членамі ААН. Вядома і тое, што з 1945 на 1990 гг. пазіцыя БССР, як члена ААН, поунасцю вызначалася інструкцыямі з Масквы.

Аднак калі абмежавацца выключна стэнаграмамі паседжанняу многіх структурных падраздзяленняу ААН, як спецыялізаваных арганізацый, то можна зрабіць выснову аб тым, што БССР і ГДР вельмі пленна супрацоунічалі у рамках ААН Фармальна узаемадзеянне беларускай і усходнегерманскай дэлегацый ахапіла шырокі спектр пытанняу: міжнародная бяспека, раззбраенне, праблемы узаемадачыненняу Поунач-Поудзень, барацьба з тэрарызмам і г.д. Зусім рэдкімі былі факты узаемадзеяння дэлегацый БССР і ФРГ.